**Іваноў, Я. М.** Разгром гарнізона ў в. Бычыха / Я. М. Іваноў **//** Памяць : Гарадоцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Н. А. Бурунова [і інш.] ; уклад. С. І. Садоўская ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мн. : Беларусь, 2004. – С. 355–356.

## РАЗГРОМ ГАРНІЗОНА Ў В. БЫЧЫХА

**З успамінаў Я. М. Іванова, камандзіра атрада 2-й Беларускай партызанскай брыгады**

У маі 1942 камандаванне 2-й Беларускай партызанскай брыгады вырашыла разграміць нямецка-паліцэйскі гарнізон, што размяшчаўся ў Бычысе. Разведчыкі 3-га партызанскага атрада вывучылі размяшчэнне агнявых кропак гарнізона і аховы чыгуначнай станцыі.

У дзень аперацыі была ўзнята ўся партызанская брыгада. Зрабіўшы 40-кіламетровы пераход, партызаны сканцэнтраваліся ў лесе каля в. Шчанькова. Кожнае падраздзяленне мела канкрэтную задачу. Штурмаваць гарнізон на сядзібе МТС было даручана майму атраду, а станцыю Бычыха – першаму атраду.

Месца размяшчэння гарнізона было абнесена калючым дротам. На ноч вароты шчыльна зачыняліся і падпіраліся казламі. Наступаць вырашылі з паўночнага боку. Тут агароджа калючага дроту падыходзіла да высокага жыта, па якому партызаны непрыкметна падабраліся да самай агароджы і заляглі, чакаючы сігнал да атакі.

Маладому партызану-разведчыку Васільеву С. Д. было даручана заданне: знішчыць кулямётную кропку ворага, якая знаходзілася ля сцяны цагельнага будынка. Амаль адначасова з выпушчанай ракетай – сігналам для агульнай атакі – раздаўся выбух звязкі гранат. Кулямётная кропка знішчана. Партызаны накінулі на калючы дрот сваю вопратку, пераадолелі перашкоду і ўварваліся на тэрыторыю гарнізона. Памяшканні закідалі гранатамі. Немцы і паліцаі, якія засталіся жывымі, выскоквалі на двор у бялізне, а тут іх чакалі партызанскія кулі.

Адначасова са штурмам гарнізона завязаўся бой і на чыгуначнай станцыі. Запалалі станцыйныя памяшканні, вагоны. Былі ўзарваны стрэлкі, вадакачка.

Бычыху пакідалі на досвітку пасля паспяховага завяршэння аперацыі. У якасці трафеяў былі захоплены зброя і абмундзіраванне.